**Вольга Чумакова**



**Намеснік дырэктара Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна**

# ДА ВЫТОКАЎ РУКОЙ ДАКРАНУЎШЫСЯ

**Таццяна Пашкоўская**



**Загадчык аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна**

У фае першага паверха Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна на працягу 2017 г. дзейнічала выстава-вітрына «Кніжная памяць Беларусі» і выстава-планшэт «Кнігадрукаванне на Магілёўшчыне ў свеце развіцця друку Беларусі». Да памятных дат кніжнага календара (Сусветнага дня кнігі, Сусветнага дня пісьменніка, Дня беларускага пісьменства) у аддзелах бібліятэкі арганізаваны выставы: «Книга. Предназначение. Вечность», «Да вытокаў рукой дакрануўшыся», «Францыск Скарына – чалавек-энцыклапедыя», «Вобраз Скарыны ў творах выяўленчага мастацтва», «Імя, славутае ў вяках», «Ф. Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга» і інш.

Падчас правядзення аглядаў выстаў асаблівая ўвага надавалася факсімільнаму выданню кніжнай спадчыны Францыска Скарыны, якое абласная бібліятэка набыла дзякуючы агульнанацыянальнаму выдавецкаму праекту па факсімільным аднаўленні кніжнай спадчыны Ф. Скарыны, ініцыятарамі якога з'яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) і ААТ «Банк БелВЭБ».

Трохтомнае факсімільнае выданне Біблії Ф. Скарыны на працягу 2017 г. знаходзілася ў агульнай чытальнай зале абласной бібліятэкі на кніжнай выставе «Імя яго гучыць у стагоддзях!» разам з кнігамі, ілюстраванымі энцыклапедыямі, даведачнымі выданнямі, у якіх распавядаецца пра найважнейшыя падзеі ў жыцці гуманіста, асветніка, першадрукара.

Значэнне падзеі з нагоды 500-годдзя выдання першай друкаванай беларускай кнігі мела адлюстраванне ў ініцыятыве Магілёўскай абласной бібліятэкі па правядзенні абласнога конкурсу «Скарынавай душою ўзлашчанае слова…». На лепшы літаратурны твор, прысвечаны жыццю і дзейнасці Ф. Скарыны, спаборнічалі тры ўзроставыя катэгорыі. Сярод удзельнікаў з розных куткоў Беларусі, Расіі і нават Германіі вызначыліся 6 пераможцаў у намінацыях «Проза» і «Паэзія», якім былі ўручаны дыпломы I, II і III ступені і памятныя прызы.

Інтэрнэт-прадпрымальнік Наталля Ніканчук (псеўданім – Лія Родная) атрымала дыплом I ступені ў намінацыі «Паэзія» за вершы, прысвечаныя Ф. Скарыну і беларускай мове, і дыплом II ступені ў намінацыі «Проза» за аповед «Апошнія грошы». Другое месца ў намінацыі «Паэзія» прысуджана Святлане Цмугуновай з Дрыбіна, трэцяе – вучаніцы 4 класа з вёскі Калодзішчы. У намінацыі «Проза» дыпломам I ступені адзначана Святлана Ластачкіна – член народнага літаратурнага аб'яднання «Роднае слова» з Горак за аповед «Несущая мудрость и свет». Дыплом III ступені атрымаў Аляксандр Вайц – ураджэнец Омскай вобласці, які з 1994 г. жыве ў Германіі.

З 2010 г. Магілёўская абласная бібліятэка праводзіць Пысінскія чытанні, прысвечаныя папулярызацыі жыцця і творчай спадчыны паэта-земляка Аляксея Пысіна. У 2017 г. у рамках VII Пысінскіх чытанняў 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, 750-годдзю Магілёва і 90-годдзю пісьменніка і сцэнарыста Алеся Адамовіча прысвячалася канферэнцыя «У небе і кнізе – сонца», якая была адкрыта вершам «Скарынава слова» з кнігі Анатоля Зэкава «Лічба з літарай сябруюць». Дырэктар бібліятэкі Ілона Сарокіна ў прывітальным слове да ўдзельнікаў мерапрыемства ўзгадала знакавыя юбілейныя даты года, падкрэсліла значнасць асобы беларускага першадрукара, які роўна 500 гадоў таму выдаў першую друкаваную беларускую кнігу – Псалтыр, а таксама значнасць гэтай падзеі для ўсяго ўсходне-славянскага кнігадрукавання.

Пра ролю скарынінскай друкаванай кнігі, творчасць пісьменнікаў А. Пысіна, А. Пісьмянкова, А. Адамовіча, пра грамадскую ініцыятыву па стварэнні музея Алеся Адамовіча ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці распавядалі пісьменнікі, журналісты, краязнаўцы, бібліятэкары і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова.

У 2016 г. адбылася значная падзея для Магілёўшчыны – у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» выйшла кніга «Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку», падрыхтаваная НББ. Выданне прадстаўляе багатую спадчыну магілёўскага кнігадрукара Спірыдона Собаля і яго паслядоўнікаў XVII–XVIII стст. Народжаны ў Магілёве, ён стаў вядомым праваслаўным друкаром Беларусі першай паловы XVII ст., распачаўшы кнігавыданне ў Куцейне, Буйнічах і Магілёве. С. Собаль выдаў першы на землях сучаснай Беларусі Буквар. Бібліятэкары прадставілі выданне, а дапоўніў прэзентацыю кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, магілёўскі гісторык і краязнаўца І.А. Пушкін, які напі-

саў для кнігі артыкул «Гістарычныя адметнасці горада Магілёва».

Асобная частка канферэнцыі прысвячалася славутым дзеячам – ураджэнцам Магілёўшчыны. Пра цікавыя факты з жыцця вядомых магілёўцаў – друкара І. Труцэвіча і выдаўцоў братоў Гранат, доктара медыцыны Л.І. Галынца – удзельнікі канферэнцыі даведаліся са змястоўных дакладаў супрацоўнікаў бібліятэкі.

У рамках адкрыцця Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў бібліятэцы адбылося свята кнігі і чытання «Кніга збірае сяброў». Гасцям свята была прадстаўлена кніжная выстава «У родным слове – цэлы свет», адзін з раздзелаў якой («Наш першадрукар») прысвячаўся Ф. Скарыну. Вядучыя, вучні 8 класа гімназіі № 3, пачалі свята з міні-сцэнкі, якая пазнаёміла ўдзельнікаў з вобразам асветніка і кнігадрукара. Разам з вядучымі дзеці здзейснілі падарожжа ў гісторыю кнігі і кнігадрукавання, успомнілі беларускія народныя прыказкі аб кнізе, паслухалі вершы вядомых беларускіх паэтаў пра першадрукара: Уладзіміра Мазго, Максіма Танка, Міхася Пазнякова, Анатоля Зэкава.

Дырэктар бібліятэкі І. Сарокіна ўручыла дыпломы лепшым чытачам аддзелаў абслугоўвання дзяцей. Свята ўпрыгожыў міні-спектакль «Муха-ха» ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнай студыі «У кропку» Магілёўскай дзяржаўнай дзіцячай школы мастацтваў № 1 (мастацкі кіраўнік В.Ю. Бялова) і музычныя нумары выхаванцаў Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў.

Далейшая праграма Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі прадугледжвала прэзентацыю-знаёмства з кнігай «Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку», правядзенне гістарычнага падарожжа з мультымедыйнай прэзентацыяй «Першадрукар Зямлі Беларускай».

Ф. Скарыну прысвячаўся занятак «Францыск Скарына – наш слаўны першадрукар». Правесці яго запрасілі каардынатара праекта, загадчыцу сектара навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ Таццяну Сапега. Таццяна Андрэеўна захапіла навучэнцаў расповедам пра першадрукара. Яны з цікавасцю падарожнічалі з Францішкам па карце Еўропы і даведваліся, дзе ён нарадзіўся, вучыўся і працаваў, а потым з захапленнем шукалі постаці Скарыны на карцінах мастакоў, размалёўвалі гравюру з выявай першадрукара ў тыя колеры, якія лічылі правільнымі. У завяршэнне дзеці склалі пазлы – яркія ілюстрацыі аб дзейнасці першадрукара.

Да Дня славянскага пісьменства і культуры для вайскоўцаў 3-га асобнага патрульнага батальёна вайсковай часці 6713 супрацоўнікі агульнай чытальнай залы правялі гістарычнае падарожжа «Першадрукар Зямлі Беларускай», бібліяграфічны агляд па факсімільным выданні Біблії Ф. Скарыны, а мультымедыйная прэзентацыя пазнаёміла з асноўнымі момантамі яго жыцця і дзейнасці.

Неаднаразова супрацоўнікі юнацкага аддзела праводзілі гістарычна-паэтычную вандроўку «Слаўны сын Беларусі». Праз вершы беларускіх паэтаў і паведамленне бібліятэкара дзеці пазнаёміліся з творчай біяграфіяй асветніка, адказвалі на пытанні, правяраючы сябе на ўважлівасць, выконвалі заданні рознай складанасці: чыталі выказванні пра Ф. Скарыну, даведваліся, як сапраўдныя мастакі афармлялі буквіцы алоўкамі і фламастарамі, складвалі пазлы з выявамі першадрукароў – Ф. Скарыны і С. Собаля.

Традыцыйныя Дні адчыненых дзвярэй у верасні прысвячаліся знакавым датам і падзеям 2017 г.: Году навукі, 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, 135-годдзю класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа і, вядома, новым і лепшым кнігам. У праграме Дзён юнацкім аддзелам для моладзі была праведзена сустрэча-інтэрв'ю з юным літаратарам Маргарытай Садоўскай «Чараўніцтва пяра». Для гасцей бібліятэкі прагучала новае апавяданне Маргарыты «Падарожжа да Скарыны», якое яна прысвяціла 500-годдзю беларускай друкаванай кнігі.

У аддзеле абслугоўвання малодшых класаў для хлопчыкаў і дзяўчынак, а таксама іх бацькоў і ўсіх тых, хто цікавіцца дзіцячай мастацкай і пазнавальнай літаратурай, Дні адчыненых дзвярэй называліся «Аз, Буки, Веди – дорога к книге». Для вучняў малодшых класаў прайшло мультымедыйнае падарожжа «Першых кніжак Святло» пра гісторыю з'яўлення пісьменства і кнігадрукавання і першыя кнігі для дзяцей на беларускай мове – «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі і «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа. Хлопчыкі і дзяўчынкі прынялі актыўны ўдзел у відэагульні «Па слядах старажытнай пісьменнасці», гульнях-віктарынах «Што бывае ў бібліятэцы?», «Што любіць кніга?» (аб правілах паводзін у бібліятэцы і беражлівых адносінах да кнігі), віктарыне «Героі любімых кніг», адгадвалі загадкі і ўспаміналі прыказкі аб кнізе.



Падчас агляду кніжнай выставы «Ф.Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга» ўвазе чытачоў былі прадстаўлены кнігі Анатоля Клышкі з аднайменнай назвай розных гадоў выдання, а таксама кніга на рускай мове Евы Нэм «В гостях у Франциска Скорины» для чытання дзецям.

На працягу 2017 г. 500-годдзю беларускага кнігадрукавання прысвячаліся шматлікія сустрэчы з беларускімі і магілёўскімі пісьменнікамі: Янай Явіч, Дзмітрыем Юртаевым, Лізаветай Палеес, Надзеяй Драбышэўскай і інш. Для вучняў праводзіліся экскурсіі па бібліятэцы і Музейным пакоі гісторыі кнігі і бібліятэкі. У аддзеле, дзе захоўваецца рэдкі фонд абласной бібліятэкі, моладзь зацікавілася тэматычнай выставай «Гартаем рарытэты».

Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі імкліва ўвайшлі ў бібліятэчную дзейнасць і адкрылі прынцыпова новыя магчымасці для яе ўдасканалення. Арганізацыя і правядзенне ўсіх бібліятэчных мерапрыемстваў

праходзіла з выкарыстаннем мультымедыйных прэзентацый. У рамках бібліятэчнага праекта па стварэнні відэаролікаў супрацоўнікі інфармацыйна-даведачнага аддзела зрабілі відэа «Вялікі сын Беларусі – Францыск Скарына», якое таксама нязменна суправаджала мерапрыемствы.

Інтэрнэт-наведвальнікам на сайце бібліятэкі прапануецца здзейсніць віртуальнае падарожжа «Памяці вялікага першадрукара» па месцах, звязаных з жыццём і дзейнасцю Ф. Скарыны, пазнаёміцца з гісторыка-культурнымі аб'ектамі, якія ўвекавечваюць яго памяць, праверыць свае веды ў віктарыне «Францыск Скарына, або Як да нас прыйшла кніга».

З 2016 г. Магілёўская абласная бібліятэка – удзельнік круглых сталоў «Духоўна-маральная місія бібліятэкі ў сучасным грамадстве», якія праводзяцца Курскай абласной навуковай бібліятэкай імя М.М. Асеева ў рамках Міжнародных навукова-адукацыйных Знаменскіх чытанняў «Хрысціянскія каштоўнасці ў зменлівым свеце: праблема выбару». У 2017 г. у рамках XIII Міжнародных Знаменскіх чытанняў анлайн-паведамленне бібліятэкі «Францыск Скарына – заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання» прысвячалася жыццю і друкаванай спадчыне чалавека выключна шырокай эрудыцыі, а таксама праекту Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і ААТ «Банк БелВЭБ» па факсімільным узнаўленні кніг Ф. Скарыны, выдадзеных у 1517–1519 гг. у Празе і ў 1522–1525 гг. у Вільні.

Мерапрыемствы, якія ў большасці праводзіліся сумесна з раённымі цэнтрамі культуры і сельскімі клубамі, агульнаадукацыйнымі школамі, адрознівала выкарыстанне мультымедыйнай тэхнікі, арганізацыя кніжных выстаў аб гісторыі кнігадрукавання: «Святыні друкаванага слова», «Беларуская кніга: шляхамі стагоддзяў», «Друкаванае слова на Магілёўшчыне» і інш.

Юбілею выдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны прысвячаўся мультымедыйны гістарычны экскурс «Імя яго гучыць у стагоддзях», праведзены Быхаўскай цэнтральнай бібліятэкай імя Б.В. Стральцова сумесна з раённым цэнтрам культуры. Былі прадстаўлены тэатралізаваная пастаноўка «Матчына мова – мова Айчыны» і дакументальны фільм «500 гадоў з гісторыі беларускага кнігадрукавання». З удзелам дзяцей і падлеткаў адбылося літаратурнае свята «Беларускай пісьменнасці прысвячаецца...» у Сакольніцкай сельскай бібліятэцы Крычаўскай бібліятэчнай сістэмы. Удзельнікі свята прыгадалі асноўныя старонкі гісторыі беларускага кнігадрукавання, пазнаёміліся з дзейнасцю беларускіх асветнікаў Е. Полацкай, Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, С. Собаля, прынялі ўдзел у віртуальным падарожжы па гарадах-сталіцах Дня беларускага пісьменства.

Прэзентацыю тэматычнай выставы-інсталяцыі «Скарбы кніжных паліц» правяла Дрыбінская цэнтральная бібліятэка. Замацаваць атрыманыя веды госці мерапрыемства змаглі праз ужо згаданую анлайн-віктарыну «Франциск Скорина, или как к нам пришла книга», размешчаную на сайце Магілёўскай абласной бібліятэкі.

З выставачнай экспазіцыяй «Беларуская кніга: дарогамі стагоддзяў» Бялыніцкая цэнтральная бібліятэка прыняла ўдзел у раённым фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2017». Для тых, хто жадаў паспрабаваць сябе ў ролі друкара, працавала бібліятэчная «друкарня», праходзіў майстар-клас па лінагравюры «Пекла буквіцы ды слова». А на імправізаванай карце Беларусі былі адзначаны гарады, дзе знаходзіліся першыя друкарні: Бярэсце, Нясвіж, Орша, Магілёў, а таксама і Бялынічы – у 1652 г. тут працавала друкарня пры кляштары кармелітаў.

Бібліятэкі Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Бабруйска ў гарадскім парку культуры і адпачынку і каля дзіцячай бібліятэкі № 6 імя М. Астроўскага арганізавалі работу інтэрактыўных бібліятэчных пляцовак «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга». Тут была створана атмасфера старажытных часоў – гучала беларуская музыка і песні, можна было апрануцца ў касцюм Скарыны і сфатаграфавацца ў вобразе знакамітага першадрукара, адказаць на пытанні інтэрактыўных віктарын.

«Скарына – чалавек свету» – цыкл інтэрактыўных мерапрыемстваў у бібліятэках ЦСДПБ Магілёва: прагляд відэафільма «Скарына – чалавек свету», занияткі-спаборніцтвы «Складзі пазл: Францыск Скарына», анлайн-віктарына «Магія першай фразы», конкурс на арыгінальную размалёўку «Раскрыць Францыска Скарыну». Запамінальным момантам стала магчымасць зрабіць на памяць фота на фоне аб'ёмных 3D-роставых фігур «Францыск Скарына» і «Беларуская кніга».

Прысвячаліся 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і пасяджэнні падлеткавых клубаў і аматарскіх аб'яднанняў. Напрыклад, адна з сустрэч краязнаўча-патрыятычнага клуба «Радзімічы» Слаўгарадскай цэнтральнай бібліятэкі праходзіла ў форме вечара-партрэта «Ля вытокаў беларускага кнігадрукавання». Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з асветніцкай дзейнасцю Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў. Ішла размова пра кнігавыданне ў сучаснай Беларусі, у тым ліку на Магілёўшчыне.

Пашырэнню кругагляду і павышэнню ўзроўня адукацыі бібліятэчных супрацоўнікаў, набыццю прафесійных навыкаў па арганізацыі працы ў рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання спрыяла правядзенне мерапрыемстваў па бесперапыннай прафесійнай адукацыі. Так, падчас раённага семінара Хоцімскай бібліятэчнай сеткі «Кнігі Скарыны – духоўная спадчына, нацыянальная рэліквія і святыня» бібліятэкары атрымалі кансультацыю «Кніжная мудрасць стагоддзяў: праца бібліятэк да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання», здзейснілі гістарычны экскурс «Францыск Скарына – асветнік і першадрукар». Практычны занятак «Выкарыстанне інтэрактыўных рэсурсаў у рабоце бібліятэк па прапагандзе кніжнай спадчыны Францыска Скарыны» дазволіў замацаваць атрыманую інфармацыю праз анлайн-віктарыну «Франциск Скорина, или как к нам пришла книга», распрацаваную абласной бібліятэкай.

Вучоны, пісьменнік, перакладчык і мастак, доктар філасофіі і медыцыны, гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння даў нам павучальны прыклад, колькі можа зрабіць адзін чалавек, асабліва калі ён патрыёт і працаўнік. Бібліятэкі Магілёўшчыны і ў далейшым будуць папулярызаваць асобу Ф. Скарыны і створаны ім нацыянальны скарб, які па сённяшні дзень услаўляе беларускі народ.

Summary

The article is devoted to the events dedicated to the 500th anniversary of Belarusian printing in the libraries of Mogilevschina.